*Наталля Лобань*

# КАНЦЭПТ *АГОНЬ* І ЯГО СІМВАЛІЗАЦЫЯ Ў АПАВЯДАННІ “ПОЛЫМЯ” Ф. М. ЯНКОЎСКАГА

Адной з задач сучасных мовазнаўства і літаратуразнаўства з’яўляецца пошук і аналіз “ключавых” канцэптаў, якія дазваляюць меркаваць аб нацыянальнай літаратуры з гледзішча культурна-гістарычных, эстэтычных заканамернасцей іх развіцця. Найбольш значнымі, ключавымі канцэптамі з’яўляюцца “скразныя” вобразы-сімвалы. Ні адзін пісьменнік, напэўна, не можа абысціся без прадметных вобразаў-дэталей (“дарога”, “сонца”, “зорка”, “хата” і інш.). На значнасць сімвалічных вобразаў указваюць шматлікія даследчыкі літаратуры і мовы (Б. Ларын, В. Кожынаў, М. Бахцін і інш.). Даследаванне сімвалізацыі ключавых канцэптаў з’яўляецца актуальным у сувязі з праблемай прыгожага, узвышанага ў літаратуры.

Да ліку ключавых канцэптаў у беларускай літаратуры і культуры можна аднесці вобраз-сімвал *агонь* (*полымя*). Мэта артыкула – прасачыць асаблівасці працэсу сімвалізацыі канцэпту *агонь* (*полымя*) у апавяданні Ф. Янкоўскага “Полымя”, выявіць індывідуальна-аўтарскую рэпрэзентацыю сімвалічных значэнняў канцэпту, акрэсліць асноўныя тэндэнцыі ў пераўтварэнні сэнсавай структуры і функцый вобраза-сімвала *полымя.*

Тэрмін *канцэпт* вядомы ў філасофіі, псіхалогіі, лінгвістыцы, літаратуразнаўстве (Д. Ліхачоў, Ю. Сцяпанаў, Г. Сцернін, В. Тэлія і інш.). У літаратуразнаўстве *канцэпт* – складаны комплекс сэнсаў, сістэма ўніверсальных і індывідуальных значэнняў, якая дазваляе ўбачыць свет вачыма пісьменніка, як асобы, як прадстаўніка сваёй нацыі, краіны, як носьбіта прапамяці, прагісторыі, пракультуры [3, с. 12]. *Канцэпт* – сэнсавая структура, у якую ўваходзяць паняційныя, вобразныя, каштоўнасныя і сімвалічныя значэнні. Асабліва актуальным уяўляецца даследаванне сімвалічных значэнняў *мастацкага канцэпту*, які знаходзіць сваё выражэнне ў мастацкім вобразе, сімвале, пранізвае ўсю структуру твора, выходзіць за яго межы, звязваючы з іншымі творамі аўтара, мастацкай літаратурай, культурай нацыі [1, с. 52]. У лінгвістыцы першапачаткова англійскае слова *concept* перакладалася як “паняцце”. Лінгвісты прыйшлі да высновы, што канцэпт уключае паняцце, а не вычэрпваецца ім, ахоплівае ўвесь змест слова (Л. Чарнейка). Вызначэнне канцэпту як культурна-ментальна-моўнай адзінкі адносіць канцэпты да сферы мовы (Ю. Сцяпанаў). У лік канцэптаў уваходзяць лексемы, значэнні якіх адлюстроўваюць нацыянальную моўную свядомасць і фармуюць наіўную карціну свету носьбітаў мовы. Гэта семантычныя ўтварэнні, пазначаныя лінгвакультурнай спецыфікай, якія адлюстроўваюць менталітэт моўнай асобы пэўнай этнакультуры. Кагнітыўная лінгвістыка вызначае канцэпт як адзінку канцэптасферы. *Сімвал* – мнагазначны іншасказальны вобраз, заснаваны на тоеснасці або падабенстве прадметаў і з’яў рэчаіснасці [2]. *Сімваліза-*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*цыя* – стварэнне сімвалаў на аснове самых разнастайных асацыяцый. Любы мастацкі сімвал ёсць мастацкі вобраз, але не ўсякі мастацкі вобраз з'яўляецца сімвалам. На нашу думку, паняцці канцэпт і вобраз-сімвал цесна звязаны паміж сабой, бо канцэпт – гэта адзінства розных асацыяцый, гэта сума ўсіх значэнняў, і ў першую чаргу, сімвалічных.

Вядома, што ў народных уяўленнях *агонь* успрымаўся як стыхія, надзеленая дваістай сімволікай. З аднаго боку – святло і цяпло, з другога боку – небяспечная сіла, якая нясе разбурэнне і смерць. Канцэпт *агонь* добра вядомы шматлікім паэтычным сістэмам і школам. Напрыклад, яго семантычная разнастайнасць знайшла сваё ўвасабленне ў паэтычнай спадчыне Якуба Коласа. Вобраз-сімвал *полымя* з той жа паэтычнай "сям'і", што і *агонь*. Ужыванне вобраза-сімвала *полымя* Ф. Янкоўскім абумоўлена традыцыяй (сімвалічныя сэнсы вобраза – як варыянта канцэпту *агонь* – трывала ўвайшлі ў сістэму беларускай літаратуры). Аднак, уключаючы яго ў інтэнсіўны працэс аўтарызацыі, пісьменнік творча перасэнсоўвае, трансфармуе яго ў адпаведнасці са сваімі эстэтычнымі прынцыпамі. У апавяданні Ф. Янкоўскага вобраз *полымя* – ключавы, апорны. Сэнсава блізкім да яго выступае *агонь* (*агеньчык*, *агонь-агеньчык*, *аганёк*). Акрамя таго, да вобраза *полымя* ў тэксце ёсць кантэкстуальныя сінанімічныя вобразы – *пярун*, *бліскавіца-маланка*, *гром*, *грымоты* і інш. У стварэнні вобраза ўдзельнічаюць і такія моўныя адзінкі, як прыметнікі (*добрае*, *чыстае*, *жывое*, *зыркае*, *шустрае*), дзеясловы (*паліць*, *палаць*, *гарэць*, *сагравацъ*, *свяціць*, *выпальваць*, *распальваць*, *спапяліць*), назоўнікі (*печ*, *святло*, *прысак*, *вуголле*, *ражон*, *цеплыня*) і г. д. Невыпадкова аўтар выносіць *полымя* ў загаловак апавядання. Тэкст апавядання падзяляецца на 11 частак, міні-апавяданняў. Усе яны звязаны паміж сабою адным вобразам *полымя*, цэнтральным сэнсавым і ідэйным ядром твора. Вобраз атрымоўвае ўсё новыя і новыя дадатковыя сэнсы і ў выніку набывае ў межах тэксту сімвалічныя значэнні, разгортваецца як мнагазначная мастацкая ідэя. Прасочым актуалізацыю сімвалічных значэнняў канцэпту *агонь* (*полымя*) у апавяданні Фёдара Янкоўскага:

1. Сімвал любові і пашаны да роднага, бацькоўскага, да Бацькаўшчыны: *Я стаяў перад бацькавым **полымем.** Свяці ж і свяціся, **полымя**! Як трэба яно, гэта святло! Сваё і на сваёй бацькаўшчыне. Дзеля самой Бацькаўшчыны! Ты свяціла мне, **полымя**, ты адорвала мяне неацэннаю навукаю руху, жвавасці, жыцця. Я назаўсёды сагрэты бацькавым **полымем** на Бацькаўшчыне...*

2. Сімвал маленства, дзяцінства, мірнай працы, душэўнага цяпла: *...Яно цешла, рухавіла, калі дзіцячым гуртам на ўзмежку раскладалі **агонь**-цяпельца... **Полымя** на полі. Працавалася... Грэўся пры **полымі**, калі было холадна. І грэўся, калі яно, **полымя**, было адно, а я бегаў, хадзіў, нешта адносіў, прыносіў і быў не каля цябе, **полымя**, быў хораша заняты, у*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*працы... Пры* ***полымі*** *пралі кужаль, воўну, кудзелю, трасцілі і сукалі ніткі, снавалі аснову, вязалі, цыравалі, рабілі нераты, чыталі, расказвалі суровую праўду і вясёлыя, што ўсе за бокі-жываты браліся, здарэнні, гісторыі, казкі...*

3. Сімвал бяды, гора і смерці, сімвал вайны: *Часам і там, пад Выбаргам, было* ***полымя****. Дзе-небудзь у яме, між валуноў або ў крутабокім і вузкім рове...* ***Полымя*** *там не грэла... Засталіся пры* ***агні-полымі*** *два салдаты, грэліся, прыграваліся і непрыкметна апускаліся на снег. Засыпалі...* ***Агонь*** *дагараў. Ля вогнішча ляжалі скурчаныя нестрэляныя ахвяры яе, пачвары-вайны...* ***Агонь*** *не разбірае, не выбірае, што трэба пашкадаваць.* ***Агонь, полымя*** *з'ядалі тады, здаецца, і зямлю, і каменне, і бетонныя палі, на якіх трымаліся масты. Не было такіх сутак, каб людзі не бачылі ў вайну на Міншчыне – на поўнач ці на поўдзень, на захад ці на ўсход ад сваёй хаты – і не казалі: "Зноў недзе гарыць... Зноў паліцца..."*

*Любоў маю гадавалі і мацавалі цяжкія гады жахлівага* ***полымя****, жахлівых грымотаў і перуноў над краем. Любоў дала мне сілы і волю рабіць, працаваць дзеля Радзімы, дзеля роднага.*

4. Сімвал абуджэння сіл, вяртанне да жыцця, 'жыццё': *Удвух глядзім без слова на* ***полымя****...* ***Полымя*** *пасылала нам цеплыню, сваю ласку. Яно і на макулінку не сунімалася, не прыпынялася. Бесперапынны, несціханы, неўтаймоўны рух. Да самага попелу. "Неяк будзем", – кажа бацька. Паказваючы на полымя, я казаў: яму весялей... варушыцца і спяшаецца... І бацькава. Пра імклівы ручаёк... Жыве...*

*Шукаў паратунку на прыродзе, у прыроды. Не было тады і аднаго дня не ў лесе і без* ***полымя****. У родным лесе. Распальваў* ***агонь****, перакусваў, глядзеў і слухаў. Чытаў...*

5. Сімвал свабоды, барацьбы за волю, разняволенне: *Яны [хлопцы] ведаюць пра Уладыкі, пра лясы. Пра* ***полымя****, каб не гібеў селянін – калісь бядак пахілы; каб людзі збаўляліся ад няволі. У гэтым краі былі каліноўцы, цэлы атрад. Была тут трагедыя. Нехта падказаў ці прывёў сюды мураўёўскае войска. Ідуць хлопцы на Уладыкі, дзе помнік войску атамана непадробнай мужыцкай праўды.*

6. Сімвал людской памяці, сімвал вечнага, святога-свяшчэннага, незабыўнага, бессмяротнага: *Штодзень не раз бачыў помнік, пры ім неапісальнае* ***полымя****. Глядзеў на* ***агонь-агеньчык****, бачыў яго як кветку цеплыні, радасці жыцця. Бачыў знак памяці, знак патрэбы добрага спакою і патрэбнага людскога і людскага творчага неспакою маёй зямлі, маім людзям. Да яго,* ***агеньчыку*** *на плошчы, і разу не працягнулася мая рука нават тады, калі на дварэ было холадна, калі са мною ішлі даўнія сябры і якія першы раз былі на Круглай – на плошчы Перамогі. Ён,* ***агеньчык****, святы-свяшчэнны. Я гляджу на* ***агеньчык*** *і нязменна, не падбіраючы слоў, думаю:* ***агеньчык*** *пасылае нам сама зямля, сама пакутніца, пасылае*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*ад сябе, ад мільёнаў страчаных, ад сябе, здрасаванай, скапанай, вечна добрай і непараўнанай. Свяціся,* ***агеньчык,*** *свяціся ты, Вечны.*

7. Сімвал нялёгкіх дарог у жыцці: – *Ведаеш, што ў сне ўбачыла я? – спыталася тады ў мяне* [*мама*]. – *Такія грымоты, такі* ***пярун****, як даўно на палянцы за Зубарэвічамі. Ачнулася і думаю: як ты знёс тады? А ты, бачыла ж я, усё адно як не збаяўся. Малы, худзенькі, толькі на чатырнаццатым. Нам цяжка жылося, а ты як бы шукаў цяжэйшага, ці што...*

8. Сімвал пазнання, адкрыцця новага: *Тады то спакойна каціўся гром, то грукаў, страляў* ***пярун****, а я запынены ёю, навальніцаю, не злазячы з каня, пад паветкаю ў вёсцы Максімаўка, на мілай і непаўторнай Радашкаўшчыне, гартаў кніжкі… Тады якраз не было фашысцкіх стрэлаў, а спачатку з дожджыкам лёгка вуркатаў, спакойна каціўся родны гром, тады пераходзіў ён у грымоты, сцебануў і гахнуў раз, другі, трэці* ***пярун****, гулялі* ***бліскавіцы-маланкі****.*

9. Сімвал чысціні, абнаўлення, ажыўлення, жыццяздольнасці: *Даўно-даўно жахнулі мяне* ***пярун*** *і* ***полымя*** *над хатаю. Але не прынеслі перапалоху. Я палюбіў цёплыя грымоты, стрэлы* ***перуноў****. Я любуюся імі. З кожнаю вясною чакаю вас, родных, веснавых і летніх, гучных і гулкіх, рэзкіх і хвосткіх, магутных і патрасальных. З імі – чысціня ў прыродзе і яе ажыўленне, асвятленне. Іначай – пасля іх – бачацца і свецяцца поле і сенажаць, сад і дуброва, чалавек і птушка. Тады яны – разбуджаныя і разварушаныя, памаладзелыя і ажыўленыя. Тады яны зусім-зусім іншыя.*

10. Сімвал духоўнага ўздыму, творчага пачатку, чалавечага генію: *Яшчэ і яшчэ ўспомніцца, загаворыць простымі, непрыдуманымі – і толькі шчырымі – словамі перажытае, убачанае, незабыўнае, непрыдуманае. Будзе і пра даўняе* ***полымя****, на вуголлі ў горне маленькай вясковай кузні. І пра тое* ***полымя****, якому благоддзямі засцілі, якое тушылі, якому гнюсілі чужынцы. І пра* ***полымя*** *Кастусёва і Францішакава, пра* ***полымя*** *Купалава і Коласава. І пра тое вялікае, усёмагутнае – дзеля чалавечнасці, чалавецтва, Чалавека.*

Такім чынам, аналізуючы вобраз-сімвал *полымя* і яго значэнні ў апавяданні “Полымя” Ф. Янкоўскага, прыходзім да вываду, што сімвалічныя значэнні *полымя* Ф. Янкоўскага можна разглядаць як складовую частку культурнага канцэпту *агонь.* Індывідуальна-аўтарская канцэптуалізацыя *агню* (*полымя*) паказала, што *полымя* ўяўляецца перш за ўсё аб’яднаннем стваральнага і разбуральнага пачаткаў. *Полымя* Ф. Янкоўскага ўвасабляе ў сабе ў адным выпадку – бязлітаснасць стыхіі, у другім – любові і абнаўлення, абнаўлення не толькі асобы, а і абнаўлення навакольнай рэчаіснасці, выступае сімвалам жыцця, руху наперад. Яго *полымя* – гэта стыхія, якая змяшчае ў сабе вялізны культурны пласт. Менавіта з мнагазначнасці сімвалаў складаецца канцэпт. Можна сказаць, што *полымя* Ф. Янкоўскага гэта індывідуальна-аўтарскі спосаб успрыняцця канцэпту

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*агонь*, творча асэнсаваны і трансфармаваны аўтарам у мастацкім кантэксце. Нанізваючы на сябе цэлы комплекс матываў, *полымя* становіцца дамінантай лёсу галоўнага героя, рухальнай сілай аповеду, пранікае ва ўсе яго элементы, становячыся самай моцнай, разнапланавай і разам з тым дакладна абазначанай стыхіяй. *Полымя* выступае ў апавяданні як сімвал душы, змагання, ачышчэння, абуджэння, свабоды, разняволення, любові, жыцця, памяці, які сінанімічна суадносіцца са святлом, бацькавай хатай, печчу, Бацькаўшчынай, цяпельцам, вечным агнём, навальніцай, і ў той жа момант гэта сімвал гора, бяды, разбурэння, знішчэння, смерці, які набывае дэманічны характар, суадносіцца з пажарам, дымам, грымотамі, вайной, ворагамі-чужынцамі і г. д. Ствараецца ўражанне, што стыхія *агню* (*полымя*) нібы кіруе жыццём героя, падначальвае ход дзеянняў, здольна забіць або даць жыццё чалавеку. Даследаванне сімвалізацыі канцэпту *агонь* у апавяданні “Полымя” Ф. Янкоўскага сведчыць нам пра сэнсавае паглыбленне ўжо наяўных, вядомых сімвалічных значэнняў канцэпту, а таксама пра пашырэнне аб’ектыўных значэнняў суб’ектыўнымі, індывідуальна-аўтарскімі сімвалічнымі значэннямі.

***Літаратура***


1. Васильева, Т. И. Литературоведческий подход к изучению художественного концепта / Т. И. Васильева // Филологические науки. Вопросы теории и практики : в 2 ч. – № 7 (18). – Ч. 1. – С. 51–54.
2. Колодина, И. И. Символ в художественных произведениях / И. И. Колодина // Понимание как усмотрение и построение смыслов. – Тверь : ТГУ, 1996. – С. 40–45.
3. Лявонава, Е. А. “Палову жыцця пішу на дарозе свае імёны, палову – закрэсліваю напісанае...” / Е. А. Лявонава // Роднае слова. – 2007. – № 12. – С. 12–15.


***Васіль Шур***

## РАДЗІМА-БЕЛАРУСЬ У АНАМАСТЫКОНЕ ТВОРАЎ Ф. М. ЯНКОЎСКАГА

Пра творчасць Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага – вучонага-энцыклапедыста, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, ардэнаносца, таленавітага і самабытнага пісьменніка, патрыёта-беларуса напісана многа ў энцыклапедыях, шматлікіх рэцэнзіях, манаграфіях, дысертацыйных даследаваннях, успамінах, вучэбных дапаможніках для студэнтаў і вучняў школ. Толькі ў “*Библиографическом указателе по славянскому и общему языкознанию. Профессор Фёдор Михайлович Янковский*” (Самарканд, 1984) змешчана больш за 150 грунтоўных рэцэнзій, прысвечаных самаму рознаму аналізу яго навуковых і навукова-метадычных прац.

Далёка за межамі Беларусі вядома *лінгвістычная школа прафесара Ф. М. Янкоўскага*. Жыццёвыя прынцыпы Настаўніка, Педагога, Вучонага, як справядліва адзначыла адна з яго вучаніц В. К. Мароз, паспяхова рэалізуюцца ў вялікай і выніковай працы яго паслядоўнікаў, хто да наву-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ